# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА І ЭТНАДЫЗАЙН: ПРАБЛЕМА ДЭСАКРАЛІЗАЦЫІ

# TRADITIONAL SPIRITUAL CULTURE AND ETHNODESIGN: THE PROBLEM OF DESACRALIZATION

В. А. Вараб'ёва, Н. І. Здановіч
V. Varabyova, N. Zdanovich

Belarusian State Technological University
Minsk, Republic of Belarus
Belarusian State University
Minsk, Republic of Belarus
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт
Мінск, Рэспубліка Беларусь
*e-mail: VorobOA@bsu.by; Ninazdan@tut.by*

---

У артыкуле раскрыта роля беларускай духоўнай культуры ў працэсе фарміравання светапоглядных ідэалаў традыцыйнага грамадства. Паказаны шляхі сакралізацыі-дэсакралізацыі рытуальна-абрадавых дзействаў на прыкладзе каляндарных і сямейных абрадавых комплексаў, іх актуалізацыя і адаптацыя ў сучаснай культурнай прасторы сродкамі этнадызайну.

The article reveals the role of the Belarusian spiritual culture in the process of formation of worldview ideals of the traditional society. The path of sacralization and desacralization of ritual and ceremonial actions is shown on the example of calendar and family ritual complexes. The paper also analyzes their actualization and adaptation in the modern cultural space by means of ethnodesign.

*Ключавыя словы*: традыцыйная духоўная культура; рытуальна-абрадавае дзейства; каляндарныя і сямейныя абрады; сакралізацыя; дэсакралізацыя; этнадызайн.

*Keywords*: traditional spiritual culture; ritual and ceremonial actions; calendar and family rituals; sacralization; desacralization; ethnodesign.

---

Тое, што дызайн як сучасная праектная практыка ўсё часцей звяртаецца да традыцыйных нацыянальных форм, пластычных рашэнняў,

візуальнай спадчыны, напрыклад, арнаменту ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ці строях адзення, ужо стала звычайнай з’явай. Дызайнеры актыўна выкарыстоўваюць нацыянальныя архітэктурныя формы, формы посуду, мэблі, звяртаюцца да народных элементаў у стварэнні прадметаў матэрыяльнай культуры. Арыентацыя на традыцыю сёння, на жаль, часцей азначае зварот да формы без уліку зместу. Шаблоннае паўтарэнне вербальных рытуальных формул, харэаграфічных, музычных, пластычных элементаў і іх паслядоўна-нарматыўная фіксацыя ў спалучэнні з яркім і самабытным выкананнем стварае арыгінальны візуальна-акустычны вобраз, які прываблівае сваёй відовішчнасцю і прымардыяльнай магіяй. Пры гэтым не ўлічваецца, што кожны элемент формы мае змястоўнае напаўненне і на этапе свайго з’яўлення і актыўнага бытавання быў цалкам абгрунтаваны светапоглядам народа, больш таго, рытуальныя дзеянні і іх паслядоўнасць мелі сакральнае значэнне.

Адраджэнне нацыянальных традыцый на сучасным этапе як практыка этнадызайну павінна арыентавацца найперш на глыбокае і грунтоўнае разуменне іх сэнсу, на раскрыццё сувязі паміж зместам і формай, а не на фрагментарнае і хаатычнае аднаўленне толькі элементаў формы. Веданне зместу, закладзенага ў формах, дазволіць працягнуць традыцыю і развіць яе на новым гістарычным вітку з улікам духоўнага, матэрыяльнага і тэхналагічнага развіцця грамадства. Задача этнадызайну – актуалізаваць традыцыйныя сэнсы і схемы і адаптаваць іх да новых сацыякультурных умоў жыцця.

Духоўныя традыцыі нацыянальнай культуры сталі асновай нацыянальных каштоўнасцей; яны ўвасоблены ў коле грамадскіх прыярытэтаў, на базе якіх сфарміраваліся маральныя і этычныя ідэалы, правілы паводзін, грамадскія нормы ўзаемадзеяння. Многія з іх замацаваны ў абрадавым коле беларусаў, выступаюць у якасці арганічнага складніка абрада і функцыянуюць як носьбіты каштоўнаснага зместу і рэгулятары сацыяльных сістэм.

Уся каляндарная і сямейная абраднасць беларусаў – гэта пласты глыбока сакральнай культуры, звязанай з язычніцкім светапоглядам на чалавека і асяроддзе. У аснове традыцыйнай мадэлі свету ляжыць гарманічная еднасць прыроднага і чалавечага пачатку, іх узаемазвязанасць і ўзаемазалежнасць. Чалавек традыцыйнага грамадства, з аднаго боку, – гэта арганічная частка сусвету, яго дзеянні і лад жыцця арыентуюцца на рацыянальныя прынцыпы, закладзеныя ў прыродзе:

уставаць з першымі промнямі сонца, з пеўнямі; працуючы, вытрымліваць пэўны рытм, каб менш высільвацца; садзіцца есці, толькі калі згаладаўся і г.д. З другога боку, чалавек традыцыйнага грамадства – гэта ўвасабленне сувету, сканцэнтараваны яго носьбіт. Чалавек як малы сусвет і асяроддзе як вялікі сусвет жывуць па адных праграмах, якія адлюстраваны ў адзінай мадэлі светабудовы. Праграмы, увасобіўшыся ў рытуалах і абрадавых дзействах, сакралізуюцца. Семантыка абрадавых дзействаў можа быць зразумелай толькі пры разуменні ўсёй мадэлі.

Для прыкладу разгледзім адзін з малавядомых рытуалаў вясельнага абрадавага комплексу – «качэнне вянка маладой па стале». Рытуал уяўляе сабой некалькі простых дзеянняў у суправаджэнні песень-дыялогаў, у якіх гучыць просьба маладой да маці, бацькі і свайго маладога прыняць яе вянок. Маці і бацька адмаўляюць у просьбе, і вянок коціцца да маладога мужа. Разам з вянком у хату да мужа прыйдзе і маладая жонка.

Семантыка рытуала празрыстая, рэалізуе прынцып «падобнае выклікае падобнае»: качэнне вянка на стале імітуе рух сонца на небе. Падобна сонцу, якое коціцца па небу ад усходу раніцай да заходу ўвечары, сямейнае жыццё маладой замужніцы павінна быць доўгім і шчаслівым. Усход сонца – гэта пачатак дня-жыцця, захад – яго заканчэнне. Рух сонца – жыццёвы шлях, падчас якога сонца забяспечвае зямлю святлом, цяплом, дае жыццё. Усе гэтыя якасці выразна ілюструюць функцыянальнае кола абавязкаў шчаслівай замужняй жанчыны традыцыйнага грамадства, падкрэсліваюць яе статус, месца ў сямейнай іерархіі, якое яна зможа займаць, калі здолее стаць падобнай сонцу – дарыць святло, саграваць, даваць і захоўваць жыццё. Простае рытуальнае дзеянне, як бачым, ўвабрала ў сябе цэлую сістэму сямейных каштоўнасцей, узаемаадносін, якія сталі зразумелымі толькі ў працэсе раскрыцця семантыкі і сімволікі дзейства.

Заўважым, рытуальнае дзейства, хоць і накіравана на забеспячэнне сямейнага шчасця, застаецца толькі пажаданнем, шансам, а не рэальнасцю. Ажыццяўленне пажадання будзе залежаць ад самой асобы, у дадзеным прыкладзе – ад маладой, яе імкненняў, магчымасцей, вартасцей, здольнасцей. У сучасных умовах пры спалучэнні з вербальным і музычным суправаджэннем і адпаведнай дызайн-візуалізацыяй рытуал можа стаць сапраўдным упрыгожваннем вясельнага абраду.

Актыўная ўласная пазіцыя асобы – абавязковая ўмова рэалізацыі рытуальна-абрадавых комплексаў. Гэта пацвярджаецца і каляндарнымі абрадамі. Так, агульнапрынятае меркаванне, што калядныя звычаі – гэта святкаванне ў гонар нараджэння сонца. Традыцыя прадугледжвае шэраг абавязковых дзействаў, сярод якіх:

1. Хаджэнне з хаты ў хату групы калядоўшчыкаў.
2. Віншаванні сям'і: гаспадару, гаспадыні, дарослым дзецям.
3. Ваджэнне казы з тэатралізаваным дзействам смерці-нараджэння.
4. Частаванне калядоўшчыкаў.

Цыкл узаемазвязаных дзеянняў у сукупнасці з вербальнымі тэкстамі функцыянальна павінен і забяспечыць сям'і добры ўраджай на наступны год, і паспрыяць своечасоваму і шчасліваму ўладкаванню ўнутрысямейных пытанняў: ажаніць сына, аддаць замуж дачку. Вербальныя тэксты песень фактычна ўспрымаліся як заклінанні і праграма да дзеянняў на наступны год. Калядоўшчыкі выконвалі ролю гасцей з іншасвету: *«Мы людзі не простыя, з далёкага краю, хлопцы ўсе сталыя, з-пад самага раю. Ідзём кругом света аж ад пана Лета. Мы к лету ідзём, казу вядзём і радасць нясём»* [1, с.12], таму прымаць іх павінны былі прыязна, а ўсё сказанае імі набывала асаблівы статус прароцтва. Умацоўваў гэту думку і знешні выгляд гасцей: карнавалізаванае шэсце ў вобразах жывёл, птушак, падарожных, чужынцаў. Пры гэтым ажыццяўленне заклінанняў-пажаданняў, як і ў папярэднім прыкладзе, цалкам залежала ад гаспадароў і іх сем'яў: ад працоўных якасцей членаў сям'і, правільнасці, дакладнасці, рацыянальнасці іх дзеянняў, этыкі сацыяльных і сямейных зносін, асабістай годнасці, гаспадарлівасці, нават гасціннасці.

Ужо «пры канцы XVIII – пачатку XIX ст., – як зазначае П. Бэрк, – традыцыйная народная культура пачынае знікаць» [2, с.29], што і прыводзіць да новага «адкрыцця народа» інтэлігенцыяй. Цікавасць да традыцыйнай культуры з гэтага часу пачынае насіць іншы характар: новы рацыянальны чалавек пасттрадыцыйнага грамадства глядзіць на традыцыю з пазіцыі вонкавага назіральніка, а не ўдзельніка. Гэта прынцыпова новая пазіцыя. Чалавек і свет больш не адно цэлае. Чалавек пасттрадыцыйнага грамадства – гэта ўладар-індывідуаліст, які прагне практычных ведаў для новага светаўладкавання. Тыповы прадстаўнік новага часу – Яўген Базараў, урач-практык з рамана І. Тургенева

«Бацькі і дзеці», для якога «прырода – не храм, а майстэрня, а чалавек у ёй – работнік» [3].

Сусвет, адарваны ад чалавека, страчвае функцыю рэгулявання, а дэсакралізаваныя рытуалы і абрады ператвараюцца ў «прымхі і забабоны». Новае адкрыццё народа актуалізуе цікавасць да традыцый, яны пачынаюць запісвацца і вывучацца, аднак як факты мінулага, а не сучаснага жыцця. І гэтая тэндэнцыя працягваецца і па сённяшні дзень. Таму і важнай застаецца праблема захавання традыцыйнай культурнай спадчыны ў яе глыбінным сэнсавым напаўненні, а таксама адаптацыя традыцыйнай духоўнай спадчыны і ўключэнне яе ў сучасную культурную прастору. Спробы такой адаптацыі ўжо ёсць [4]. Мадыфікаваныя абрады ўключаюцца ў выхаваўчы працэс дзіцячых садкоў, школ, ВНУ, аднак пераважна ў якасці гульнёвых імправізацый ці тэатралізаваных пастановак. З дапамогай этнадызайну народныя традыцыі змогуць атрымаць новы імпульс да новага развіцця.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Зімовыя песні: калядкі і шчадроўкі / Рэд. М. Я. Грынблат. Мінск : Навука і тэхніка., 1975.
2. *Бэрк П.* Народная культура Эўропы ранняга Новага часу. Мінск : Тэхналогія, 1999.
3. *Тургенев И. С.* Отцы и дети [Электронный ресурс]. URL: https://ilibrary.ru/text/96/p.4/index.html (дата обращения 30.05.2023).
4. *Вараб'ёва В. А.* Традыцыйнае свята «Багач» у вучэбна-выхаваўчым працэсе // Фальклtechнарыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. навук арт. Вып. 7. – Мінск: РІВШ, 2010. – С. 313–320.